# НА ЧУЖЫНЕ АБО МАНАЛОГ-УСПАМІН ВЯЗНЯЎ НАЦЫЗМУ

## З успамінаў Н.І. Малыгінай з агр.Пагранічны

Ніне Іванаўне Малыгінай у тым далёкім ваенным 43-м было шаснаццаць. Сям'я яе -бацька, маці і малодшая сястрычка Зося - жыла ў вёсцы Хомантаўцы (цяпер Польшча. – **Рэд**.). Калі ўсталёўвалася мяжа з Польшчай, частка мясцовых жыхароў апынулася ў Беларусі, частка - у суседняй краіне. Сям'я Ніны Іванаўны пераехала ў цяперашні Пагранічны. Але ўсё гэта было пасля вайны, у 1948-м. А пара ваеннага ліхалецця прайшла для дзяўчыны ў Хомантаўцах. Адтуль яе забралі на прымусовыя работы ў Германію. Сёння на святочнай кофце Ніны Іванаўны - памятны знак "Узник нацизма". Яна памятае тыя дні ў няволі да драбніц. І вось што расказвае:

…Стаяў цёплы сакавік 43-га. Ва ўсякім разе, снегу не было. Раніца. Да нас прыбегла суседка: "Немцы вёску акружылі! Будуць, мусіць, забіраць у Германію!" Камендатура нямецкая была недалёка, у Галынцы. І мы прывыклі, што вораг наязджае ў вёску часта. Але на гэты раз усе зразумелі: да бяды іх прыезд. Нехта кінуўся за ваколіцу - там застракаталі кулямёты. А па вёсцы ўжо ехаў солтыс з пустой падводай… Немцы зайшлі да нас.



***Н.І. Малыгінай***

- Божа ж мой - мітусілася, плачучы, па хаце матуля, збіраючы мяне ў тую Нямеччыну, - няма нічога цёплага, каб апрануць цябе.

Татава сястра прыбегла з чаравікамі, маміна - з хусткай-акрыванкай. Забіралі тады многіх хлопцаў і дзяўчат. І нават сем'і. Забралі цётку Маню Каравайчык з дачкой Лідай і сынам Віцем. Іх татку, які пры панскай Польшчы палітыкаваў, немцы, па падказцы солтыса, расстралялі. І цяпер ніхто іншы, як ён, зноў указаў на гэтую сям'ю. Ліда была маёй сяброўкай, мы вучыліся ў адным класе.

- Ты трымайся цёткі Мані, нідзе не адставай ад яе, - прасіла мяне маці.

Усіх адвезлі ў Вялікую Бераставіцу, а назаўтра - на рампу тутэйшай чыгуначнай станцыі. Там да самага вечара і сядзелі. І сёння помню, як страшна было, як тужліва, слёзы самі каціліся з вачэй. Увесь

дзень фашысты звозілі моладзь з навакольных вёсак. Назбіралі цэлы састаў, саломы ў вагоны-цялятнікі паслалі - і нас усіх пагрузілі. Сцямнела. І цягнік памалу крануўся з месца. А недалёка ад вакзала— лясок. Яшчэ не набраўшы хуткасці, даехалі да яго, і тут вагон наш раптам як тузане! Потым ён спыніўся і пачаў завальвацца на бок. Крык падняўся, лямант, ніхто не ведае, што здарылася. Хлопцы кажуць: "Крушэнне! Цягнік сышоў з рэйкаў". Наша акно аказалася ўверсе, праз яго і пачалі мы вылазіць. Глядзім: і праўда, паравоз і некалькі пярэдніх вагонаў сыйшлі з рэйкаў. Ужо потым пайшлі чуткі, што гэта партызаны прымусілі стрэлачніка перавесці стрэлкі. Хто вылез - давай уцякаць у лес. Пачалася страляніна: фашысты хутка зарыентаваліся і стаялі ўжо на ўскрайку лесу з аўтаматамі. Некалькім сем'ям удалося ўцячы, але назаўтра іх прывезлі зноў.

Прывезлі нас у гарадок ва Усходняй Прусіі (цяперашні Гусеў Калінінградскай вобласці), пастроілі на пляцы. Прыехалі гаспадары выбіраць сабе парабкаў. Да мяне падышла старая фрау, хацела забраць. А я ў слёзы: "Не, не пайду!" – і матаю галавою, сама ж ушчаперылася намёртва ў цётку Маню. Гэткі страх мяне ахапіў! Старая пастаяла, махнула рукою і пайшла далей. А зноў, бачым, маладая немка з кіёчкам у руках адлічвае пятнаццаць чалавек - я з цёткай і яе дзяцьмі ў той падлік таксама трапіла - і забірае нас у свой маёнтак. Паселі ўсе ў даўжэзны воз, паехалі. Не адзін, а цэлых два маёнткі былі ў нашага баўэра. І парабкаў многа: толькі ў нашым сорак чалавек. Многа палякаў - яшчэ ад 39-га года ваеннапалонныя, ды хлопцы з нашага краю - Ваўкавышчыны, іншых блізкіх мясцін. А яшчэ тры немцы, якіх па нейкай прычыне на фронт не ўзялі: адзін дык без вока быў, другі кавалём працаваў, а трэці - наглядчыкам над намі. Паказалі чварак, перагароджаны на пакойчыкі. У нашым чатыры ложкі было, на іх спалі дзевяць чалавек. Апранулі нас, дзяўчат, у аднолькавыя зялёныя сукенкі, хлопцаў - у такога ж колеру нагавіцы і курткі. Пакойчык свой мы пабялілі, нарабілі з паперы кветак і на сценах развесілі, каб хоць трохі жыллё аздобіць. Але чужына ёсць чужына, ды яшчэ ў няволі ў ворага. Ноччу, калі плакала, цётка Маня падыдзе, бывала, і супакойвае: "Ты ж не адна тут, дзетачка, і Ліда во мая, і Віця. Дасць Бог, вызваляць нас, пойдзем дахаты…" А я, здаецца, і пасярод ночы пабегла б да таткі і мамкі, да сястры Зосі.

Зямлі ў маёнтках многа было, а трактар - адзін. То хлопцы, лічы, усё коньмі і валамі рабілі: аралі, баранавалі, сеялі, касілі, убіралі… Надта многа буракоў немцы сеялі. Ох і ўелася ў косці іх праполка! Як пойдзем ранкам, то ў полі да заходу сонца. А не скончыў палоць сваю баразну - ноччу ідзі. Стомішся за дзень, спіну ломіць, але калі пачне

сонца да зямлі каціцца, то ўсе так прыспешваюць, так стараюцца, каб хоць да канца прапалоць. Калі поле доўгае - і не ўправішся.

Аднойчы мы з дзяўчатамі рашылі: няхай застаюцца канцы, заўтра даполем. І пайшлі ў маёнтак. Павячэралі. Я зняла брудную сукенку, мыю. Дзяўчаты паснулі. А зноў, бачу, бяжыць надзіральнік: “Дзе гэтыя свінні лянівыя? - крычыць. - Марш у поле!”

Пайшлі мы. А цёмна ж ужо, што ўбачыш? Прасядзелі да ранняга досвітку і тады палолі. Прыйшлі ў чварак, паелі хлеба, папэцканага маргарынам, папілі чорнай кавы - і зноў на работу. Крыўдна да слёз, а што зробіш? А хлопец адзін, недзе з-пад Ваўкавыска ён быў, не падчыніўся надзіральніку, не пайшоў на ноч у поле.

- Мала табе, гад, што я цэлы дзень карачыўся, то ты мяне яшчэ і ноччу прымушаеш? - са злосцю крыкнуў немцу. Той жа як размахнецца ды як ударыць хлопца кулаком у твар. Хлопец упаў. А калі ўстаў, то - не вытрымалі нервы - як урэжа ў вуха немцу! А Божачка - на віду ў многіх гэта было - здранцвелі мы: усё, застрэляць бедалагу…

Немец выклікаў паліцыянта. Той прыйшоў з гумаю. Усіх нас, парабкаў, пастроілі ў двары, каб глядзелі. Паліцыянт, ці як яго яшчэ называлі, вахмайстар, біў хлопца датуль, пакуль той не ўпаў. Яшчэ і ляжачага некалькі разоў ударыў. Потым небараку адправілі ў канцлагер. А вярнуўся адтуль - мы яго не пазналі: скура ды косці. А тое, якая цяжкая рука ў фрау, я адчула на сабе. Увесь час мы хадзілі ў драўляных клумпах: цяплом насілі іх без заднікаў, накшталт шлёпанцаў, а ў зімовы час да драўлянай падэшвы была прышыта тканіна, і яны ўжо нагадвалі чаравікі. І вось парваўся адзін мой чаравік, потым - другі. Як ні зашывала іх - пальцы зноў і зноў вылазілі. Колькі ні казала фрау, колькі ні прасіла, каб дала новыя - яна нават і не слухала. А на двары зіма, ногі мерзнуць. Адзін раз асмелілася: не пайду на работу, няхай што хочуць робяць! Узяла іголку з ніткай, села каля акна і спрабую рамантаваць свой абутак. Бачу, ідзе ў чварак з кіёчкам фрау.

- Чаму не на рабоце? - пытаецца.

- Клумпы парваліся, - паказваю. - Холадна ў ногі.

- Чаму мне не сказала? - злуецца.

- Я вам не раз гаварыла. Фрау як размахнецца тым кіёчкам - ды мне па твары. Я - у плач. Мяне, кажу, нават мама ў хаце ніколі не біла.

- Во, хай мама табе і купіць ды прышле клумпы, - кінула са злосцю і выйшла.

Выручыла мяне кухарка. Немка яна была, але з добраю душою. Убачыла, у чым хаджу - дала свае чаравікі.

А атрымаць аплявуху кожны мог часта - звыклая была справа. Дзіўлюся, як каля малацілкі мяне не злупцаваў надзірацель. Была наймалодшай, то снапы на стол падаваць ставіў. Развяжаш - і падасі,

развяжаш - і падасі. А машына глынае і глынае тыя снапы - ні табе спыніцца, ні зяўнуць. І ўсе дзяўчаты ўжо без перадыху ледзьве жывыя. Просяць мяне: “Не развяжы які сноп, хоць адпачнем”. Я, бывала, кідаю сноп з перавяслам, малацілка зараве і спыняецца. Пакуль яе там глядзяць, мы без сіл падаем на салому.

Але неўзабаве надзіральнік разабраўся, што да чаго. Падступіў да мяне з крыкам, замахнуўся… Аднак штосьці стрымала яго. Мо не хацеў з дзіцём ваяваць, а мо часу пашкадаваў на мае слёзы.

Бульбу елі толькі ў нядзельку. І цяжка было, і холадна, і голадна. Ніхто не глядзеў, ці ты мокры, ці ты халодны: ідзі на работу. Помню, снапы на вазы ўкладвала - то мо абцяжылася, а мо прастудзілася: скулы пайшлі па нагах, па руках, па грудзях. Хадзіла да доктара, аперыраваў.

Многае з той пары помніцца ўсё жыццё. А цяпер, у старасці, высвечваецца чамусьці асабліва ярка. Надта, помню, есці хацелася. Маладая была, а наробішся - з’еў бы, здаецца, вала. Не ведаю, як хлопцы трывалі - яны ж пры конях, на цяжкіх работах, кароў таксама даілі. Пасылкі з хаты, праўда, многія атрымоўвалі. Але што тая пасылка - з’еў і няма яе.

Немец карміў нас супам з пастэрнаку. Ох, і ўеўся ў косці той пастэрнак. І кава іхняя чорная, і маргарын. А ўвечары варылі суп малочны - разбоўтаюць аржаную муку, малаком крыху забеляць. Суп той прыкра-салодкі і з адных камячкоў: хлопцы яго “шратоўкай” называлі. Але вараць - у шэсць гадзін вечара, а мы ў прыцемках дахаты ідзем. І ежа тая ўжо кіслая і халодная.

Неяк увечары, помню, цярпенне лопнула: хлопцы кінулі ложкі ў міскі з кіслай “шратоўкай” і пайшлі з-за стала. Мы - за імі. А есці ж хочацца. Расхрабрыліся - нарвалі агуркоў на агародзе, бульбачкі падкапалі і варылі - у бараках печкі былі. Тут ляціць аднекуль цёткі Мані сын, 12-гадовы Віця:

- Хавайце ўсё, сам гаспадар прыехаў!

Схавалі, паспелі. Немец пахадзіў па маёнтку, зайшоў у барак да хлопцаў. Тыя і паскардзіліся яму, што галодныя. Загадаў, праўда, прынесці хлеба і чорнай кавы. І нам той яды дасталося, але каб даведаўся, чаго на загонах накралі - гумы не мінаваць… Не паверыце, так ужо хацелася бульбачкі! Аж снілася яна. Але чамусьці мала яе было ў немца — ці то не расла добра, ці то не садзілі многа. Давалі толькі ў нядзельку ў абед. То ўжо так чакаеш той нядзелькі, так лупіш - аж слінкі цякуць, тую бульбачку ў мундзірах! Вярнуўшыся дахаты, я на першым часе і ранкам, і ў абед, і вечарам прасіла маму: “Звары, калі ласка, бульбы”.

Студзень 45-га быў марозны. А нашы гаспадары буды спешна ставілі на вазы -уцякаць збіраліся. Ужо выбухі снарадаў добра было

чувиць, бомбы падалі. Суседні маёнтак гарэў. Фрау першай збегла. Нас немцы таксама хацелі прымусіць ехаць. Але тыя хлопцы-палякі і самі не паехалі, і нам не раілі. "Нас хутка вызваляць!" - казалі. Нават немцам, якія ў маёнтку працавалі, даводзілі: "Не ўцякайце, рускія вас не расстраляюць".

Але ж і нацярпеліся мы, пакуль салдаты нашы прыйшлі. Гэта ж у самае пекла, пад агонь трапілі. А надзіральнік загадаў: "Сядзіце ціха, хутка вас забяруць, паедзеце ўслед за гаспадарамі".

Мы ж увечары акно выдралі - і ўцякаць. Пабеглі ў поле. Там равы глыбокія -немцы меліярацыю рабілі. У тых равах, на лёдзе, цэлую ноч і прасядзелі. Холад стаяў страшны. А яшчэ ад страху дрыжалі - страляніна вакол, цераз галавы снарады ляцяць. Развіднела. І куды нам падзецца? Пабеглі зноў у свой двор, у самы першы ад поля чварак. Але, бачым, нямецкія салдаты кулямёт на яго гарышча цягнуць. Хлопцы нашы спыніліся і камандуюць: "Уцякаем, бо будзе тут горача!" А вялізны дом баўэра ўжо дыміцца - трапіў снарад. Хто ў стайню пабег, а іншыя - ў падвал, і я з імі. Больш сутак тут сядзелі. А ў дальнім адсеку падвала, як потым мы ўбачылі, немцы хаваліся. Яны ж у акружэнне трапілі і не мелі дзе падзецца. Раптам блізка пачулі крокі па снезе і рускую гамонку.

- Таварышы, мы парабкі, рускія! Ратуйце! - крычым.

- А немцы там ёсць?

- Тут яны, узброеныя.

…Калі нам дапамаглі выбрацца наверх, дом ужо дагарэў. А мы ўздыхнулі з палёгкай: усё, доўгачаканая воля!

***

З той пары мінула 66 гадоў. Ніна Іванаўна - шчаслівая маці, бабуля, прабабуля. А яшчэ прафесія ў яе была любімая, якой аддала 38 гадоў. Паштальёнам у Пагранічным працавала, тэлефаністкай, доўгі час - начальнікам мясцовага аддзялення паштовай сувязі. Заслужыла павагу, узнагароджана ордэнам "Знак Пашаны". У калектыве раённага вузла сувязі памятаюць пра ваеннае мінулае жанчыны і кожны год віншуюць яе з Днём Перамогі.

## З успамінаў Казіміры Іванаўны Яроцкай, в. Мінчыкі:

... Родам я з Ваўкавышчыны з вёскі Кукалкі. Калі вайна ўжо на сваю другую палову павярнула, немец пачаў хапаць ды адпраўляць у Германію нават падлеткаў. Свае, відаць, рабочай сілы ўжо не было -

нават дзяцей гнаў на фронт, вось і забіраў парабкаваць з Беларусі ўсіх, каго мог.



***К.І. Яроцкая.***

Мне толькі шаснаццаць споўнілася. І дзяўчатам ды хлопцам з Талькаўцаў, Шніпава, Шылавічаў не болей было. Гэта ж дзеці яшчэ. Помню, як плакалі, які страх нас браў, калі везлі нас падводамі з Шылавічаў у Беласток: ніхто й не думаў, не спадзяваўся, што калісьці вернецца дахаты, навек развітваліся ўсе са сваімі роднымі. А ў Беластоку загналі нас за калючы дрот: казалі, тут было гета для яўрэяў. Іх усіх знішчылі, а потым сюды парабкаў звозілі, каб назбіраць на цэлы цягнік і адправіць у сваю Нямеччыну. Так і прабылі мы ў тым гета два ці мо нават і тры тыдні. Потым мне ў сям'і сказалі, што неяк брат дабіўся дазволу, каб паехаць замест мяне. Але спазніўся ён: пакуль дабраўся ў Беласток, цягнік з намі ўжо адправіўся...

Трапіла ў горад Вэлеў ва Усходняй Прусіі. Прызначылі мяне і яшчэ семярых дзяўчат працаваць на папяровай фабрыцы. Будынак - высачэнны, паверхаў на пяць. Па рацэ баржамі дастаўлялі картонкі розныя, старыя часопісы, газеты і інш. Чацвёра з нас унізе загружалі ўсё гэта ў вялізны кошык. Вінда паднімала яго на самы верх, дзе мы з дзяўчатамі рвалі ўсе тыя кніжкі і часопісы і кідалі ў вялікія чаны. На фабрыцы выпускалася шэрая папера для запакоўвання. Казалі, у ёй была надта вялікая патрэба, і мы працавалі без выхадных, зранку да адзінаццаці гадзін вечара, а перапынку на абед - не болей дваццаці хвілін. Над намі былі дзве наглядчыцы - старыя немкі, і адпачываць яны не давалі. Такая работа і слабы харч знясільвалі: кладучыся спаць, мы не адчувалі не толькі рук, але ламала ўсё цела. А начамі снілася адно і тое: як рвеш і кідаеш у ненажэрныя чаны паперу. Рвеш і кідаеш, рвеш і кідаеш... здаецца, рабіў бы любую самую цяжкую работу, толькі не гэтую. Ганялі нас і ўніз, памагаць качаць да прыстані вялікія і круглыя, як бочкі, шэрыя папяровыя катушкі.

З зімы пачалі мы прыслухоўвацца, як нешта цяжка вухкае на ўсходзе. Мы ўслухоўваліся, а хлопцы-парабкі казалі: "Нашы ідуць". Якое шчасце было чуць такое! Ах, дзеткі, тут такія баі ішлі потым. Каля ракі Одэр фронт цэлы тыдзень стаяў: колькі ж салдат на пераправе загінула, вада ад крыві была ружовай...

Мы з дзяўчатамі апынуліся далёка ад тых мясцін, дзе парабкавалі: немцы самі ўцякалі і нас перад сабой гналі - хадзілі чуткі, быццам на

бераг Балтыйскага мора, каб пагрузіць там на баржы і патапіць. Але не паспелі зрабіць гэтага, на паўдарозе кінулі.

Дзён пяць мы былі "нічые". А потым прыбіліся на той пусты хутар немцы і пачалі прасіцца, каб мы дапамаглі ім здацца рускім салдатам у палон. З намі дзяўчына з Мінску была, якая разумела па-нямецку. І калі паявіўся рускі салдат-разведчык, яго адразу папярэдзіла: "У аборы - узброеныя немцы, хочуць здацца". "Перавядзі ім, няхай кідаюць на зямлю зброю, - папрасіў той дзяўчыну. - А вы, сястронкі, хутка паедзеце дамоў! - абнадзеіў усіх нас".

Гэта было перад самым днём Перамогі. А пра тое, што ўзяты Берлін і Германія капітулявала, мы даведаліся ўжо ў поездзе, па дарозе дахаты. Усе плакалі ад шчасця. Помню, калі даехалі да мяжы Савецкага Саюза - пазналі яе па зорках, выкладзеных з чырвоных камянёў на абочыне чыгункі, то ўсе абдымаліся, цалаваліся: урэшце мы на радзіме, пра якую марылі дзень пры дні цэлых два гады.

Ніколі не забуду, як ступіла на родны падворак. Не, не ступіла - птушкай, здаецца, уляцела туды. Нашы рыхтаваліся садзіць бульбу, выносілі яе на майскую траўку, рэзалі, і такім мілым, звыклым, родным гэта было, так кранула, што я зноў заплакала.

... З той пары мінула ўжо 67 гадоў. Дзеці выраслі, унукі, праўнукі. Я на пенсіі даўно, калі праводзілі на яе - медаль за дабрасумленную працу ўручылі. Люблю і шаную ўсе святы. Але прыходзіць май, чую па радыё і па тэлевізары песню "Дзень Перамогі" - і сэрца ўздрыгне, захвалюецца, заб'ецца моцна-моцна. І зноў нахлынуць успаміны пра тое, як была на чужыне. Дарагое для мяне гэта свята - Дзень Перамогі, бо падарыла жыццё.

## З успамінаў Ніны Емяльянаўны Шыплюк, агр. Пагранічны

- У 1943 г. мне было 16 гадоў, калі мяне забралі ў Нямеччыну. Парабкавала ва Усходняй Прусіі (каля горада Элк) у баўэра: кароў даіла, свіней карміла, у полі працавала. А мела ж тады няпоўных сямнаццаць. Прытамлюся, бывала, да паўсмерці і плачу: мамачка, мілая, так цяжка мне, што й не расказаць. А каму паскардзішся? Парабак ён і ёсць парабак - ведай рабі ды маўчы.

Ды яшчэ невядомасць мучыла. Ці ж спадзяваўся хто, што дахаты вернецца? Ну і ўявіце сабе сямнаццацігадовую дзяўчыну, якая апынулася на чужыне, у той праклятай Нямеччыне, і баіцца, што будзе парабкаваць тут усё жыццё...

Божа, такі падчас роспач браў, што жыць не хацелася.



*Н.Е.Шыплюк.*

Потым я разам з іншымі парабкамі апынулася пад горадам Ландсберг - два тыдні немцы, кінуўшы ўсю сваю гаспадарку, гналі нас пехатой перад сабой. Помню, як мы да смерці стамляліся, як начавалі на дварэ, нягледзячы на халады. Потым немцы некуды зніклі, а мы сядзелі ў хляве на нейкім хутары. І раптам пачулі рускую гаворку. Гэта былі рускія разведчыкі!

Але дахаты я вярнулася толькі ў верасні. Нас з дзяўчатамі пакінулі «прыкамандзіраванымі» да ваеннай часці. Мы даглядалі жывёлу, якую немцы кінулі ў сваіх маёнтках: арміі нашай патрэбен быў харч.

Помню, якая радасць ахапіла ўсіх, калі прыйшла вестка аб Перамозе! Салдаты стралялі ўверх, мы абдымаліся, цалаваліся, плакалі. Ах, якое гэта было шчасце! Той дзень усё жыццё стаіць перад вачыма. Салдаты казалі, што Берлін узяты, на рэйхстагу развіваецца чырвоны сцяг. Здавалася, сама прырода радуецца разам з намі: такім чыстым было неба, так ярка свяціла сонца. Помню, адзін афіцэр, седзячы на кані, усё крычаў: "Ура! Перамога! Вайне канец!" І страляў з пісталета ўверх, і радаваўся як дзіця.

Скажыце, ці можна забыцца такі дзень? Ён для мяне - вялікае свята.

## Успаміны Соф'і Антонаўны Зубцовай з в. Кудрычы

…З малога не шанцавала мне ў жыцці. Жылі мы на хутары каля Клепачоў, непадалёк ад чыгункі. У бацькоў нас, дзяцей, было чацвёра: дзве мае сястры, я і наш малодшы брацік. Яму ўсяго дзевяць гадкоў было, як памерла наша мама. Мне тады чатырнаццаць мінула. Наплакаліся-нагараваліся так, што не пажадаеш нікому. А тут яшчэ і вайна.

Помню, як нямецкія самалёты бамбілі станцыю і чыгунку. Непадалёку ад нас разбамбілі эшалон з сем'ямі ваенных. Гэта было так жудасна, і мы так шкадавалі дзетак, якія засталіся без матуль. Многія знаходзілі малых у жыце, у лесе і бралі ў свае сем'і. Наша цётка Соф'я Кавальчук таксама ўзяла дзяўчынку, а Ізідар Карчэўскі – хлопчыка.

Я трапіла ў нямецкае парабкоўства ў самы ж першы набор: як толькі немцы пачалі браць моладзь у Германію, дык мне і прыйшла павестка з'явіцца ў Свіслач у камендатуру. Не ведаю, чаму гэта мяне ўзялі – дзіця ж яшчэ горкае была. Некалькі дзён трымалі нас за агароджай у Ваўкавыску. А як назвозілі моладзі на цэлы эшалон, то

пагрузілі ў цялятнікі. Думала, з голаду ў той дарозе і здохну, бо ніхто ж не карміў, а з сабой што я магла ўзяць?



*С.А.Зубцова.*

Прыехалі на станцыю – мо, я і няправільна вымаўляю цяпер яе назву, але ўсё жыццё помню, што называлася, здаецца, так: Ліхтанфэльд. Гэта паблізу ад горада Элка. Там і выбрала мяне немка ў свой маёнтак. Помню, як ехала ў брычцы і ўпотайкі, каб барані Божа не бачыла тая пані, горка плакала. Так страшна, так цяжка было на душы, што і не расказаць. Гестапавец меў многа зямлі і многа парабкаў – палонных палякаў, французаў, бельгійцаў, італьянцаў і хлопцаў з іншых краін прывозілі з лагера, з баракаў. Я жыла ў прыбудоўцы пры кароўніку. Даіла короў, каромыслам насіла малако.

Які быў з мяне работнік у шаснаццаць гадоў? Ды яшчэ на місачцы нейкага адвару з бручкі, у якім плавалі нітачкі мяса з каніны. Праз год на ліцейны завод у Кёнігсберг завезлі. Там было яшчэ горш. Як? А так, што падаеш вечарам у бараку на свае нары і думаеш, каб заўтра ўжо ніяк не прачнуцца. Дзень пры дні, без усякіх выхадных падвозілі тачкамі металалом, які вязні-мужчыны кідалі ў высачэнныя печы. Што завод выпускаў, нам не казалі, толькі дыміў ён дзень і ноч, і тым горкім ядавітым дымам надыхаліся мы ўдосталь. Сяброўкі ў мяне былі – Каця з-пад Ленінграда і яшчэ адна дзяўчына, з Літвы, то мы, помню, усё ратаваліся ад мазалёў на руках, анучкі адна адной накручвалі і змазвалі далоні, чым маглі.

Калі наступалі нашы, той завод разбамбілі, слава богу, мы засталіся жывымі. Ваенныя сказалі нам дабірацца дамоў.

Крыўдна, што такія маладыя гадочкі, як гаворыцца, самы цвет жыцця, прайшлі ў такой цяжкай няволі. А колькі ж людзей, дзяцей назаўсёды забрала тая праклятая вайна і на фронце, і ў лагерах! Страшна і падумаць. Мой муж, Аляксандр Мікалаевіч, таксама быў франтавіком, але, дзякаваць Богу, жывым застаўся. Дваіх дзяцей з ім выгадавалі. На вялікі жаль, жыву цяпер адна: Мікалаевіча майго дзесяць гадоў як няма. Пяцярых праўнукаў ужо маю і малю Бога аб адным: каб ні дзеці, ні ўнукі і праўнукі не зведалі таго, што давялося зведаць нам з мужам.

Марыя Драпеза, 2014 год.